**Палулех, З.** Час выбраў яго / З. Палулех // Браслаўская звязда. — 2008. — 16 лют. — С. 3.

## ЧАС ВЫБРАЎ ЯГО



*Вайна ў далёкім Афганістане пакінула глыбокі след у лёсе не адной тысячы беларусаў. У складзе савецкага абмежаванага кантынгента ў гэтай краіне воінскі інтэрнацыянальны абавязак выконвалі і многія жыхары Браслаўшчыны. У іх ліку і старшыня раённага савета воінаў-інтэрнацыяналістаў, суддзя Браслаўскага суда Аляксандр Сучок.*

Як дарагую рэліквію захоўвае Аляксандр Міхайлавіч маленькую, пажоўклую ад даўнасці кніжачку «Памятка савецкаму воіну-інтэрнацыяналісту». Кожнае напісанае ў ёй слова прасякнута заклікам да патрыятызму: «Дапамагчы даць адпор агрэсіі ворага ў ДРА – вось баявая задача, з якой урад накіроўвае цябе, салдат, на тэрыторыю Рэспублікі Афганістан». Яны, яшчэ зялёныя юнакі, зусім не разумелі тады, якую місію давядзецца выконваць, у якіх страшных сітуацыях бываць. Але ніхто і не патрабаваў ад іх гэтага разумення. Радзіма сказала: «Трэба!» Салдат адказаў: «Ёсць!»

У войска Аляксандра прызвалі пасля вучобы ў Відзаўскім вучылішчы. У адзін дзень далі павестку, а на другі ўжо трэба было прыбыць на прызыўны пункт. Службу пачынаў у Гродне ў зенітна-ракетнай батарэі вадзіцелем-механікам. Там праходзіў курс маладога байца, прывыкаў да армейскіх будняў.

Аднойчы пасля адбою салдат паднялі па трывозе і накіравалі праходзіць медыцынскую камісію. Гэта была нядзеля, выхадны дзень. У многіх вайскоўцаў з'явілася падазрэнне, што іх рыхтуюць да адпраўкі ў «гарачую кропку», бо пра афганскую вайну хоць ведалі мала, але чулі шмат. Іх падазрэнне апраўдалася. Тых, каго медыкі прызналі годнымі да службы ў экстрэмальных умовах, у хуткім часе адправілі на перасыльны пункт у Барысаў, а адтуль праз Сярэднюю Азію ў Афганістан.

Баявое хрышчэнне вайскоўцы прынялі ў час пераходу праз перавал Саланг. Калона з 250 машын уздымалася па серпанціне 42 км. Бронетранспарцёр, якім кіраваў А. Сучок, з-за няспраўнасці адстаў ад агульнай калоны і папаў пад абстрэл. «Адчуванне жудаснае. Кулі свісцяць

адусюль, а адкуль канкрэтна – не зразумела», – успамінае Аляксандр Міхайлавіч. На шчасце, экіпажу тады ўдалося выратавацца без страт.

Асноўным месцам службы А. Сучка быў Джэлалабад, што на самай граніцы з Пакістанам. Вайскоўцы суправаджалі калоны да Кабула, які размяшчаўся ў 180 км ад пункта іх дыслакацыі. Кожны дзень даводзілася быць літаральна ў кроку ад смерці. Але Аляксандр Міхайлавіч лічыць, што Бог уратаваў яго. У час развітання маці павесіла на шыю юнака ланцужок з крыжыкам, які і аберагаў яго ў час службы ад усіх нягод. А іх было дастаткова. Страшным выпрабаваннем стала для савецкіх воінаў аперацыя ў Панджэрскай цясніне. Удзельнічаў у ёй і А. Сучок. У глыбіні цясніны трапілі ў акружэнне бандыцкіх фарміраванняў. Трое сутак заставаліся ў варожым кольцы без вады і ежы, пакуль на выручку не прыйшла авіяцыя.

Успамінаць тыя эпізоды салдацкай службы Аляксандру Міхайлавічу нялёгка і сёння, пасля стольокіх гадоў. Афганская вайна ўрэзалася ў юнацкае жыццё нібы страшны сон і пакінула пасля сябе незагойныя душэўныя раны.

**З. Палулех**

Кажа: «Немагчыма забыць смерць сяброў, свіст куль, пастаяннае адчуванне жудасці і страху. Два разы хварэў малярыяй. У спякоту пад 60 градусаў цябе б'юць такія дрыжыкі, што немагчыма трываць, а патрэбных лекаў не было. Давалі толькі таблеткі, каб неяк суцішыць хваробу.»

Дамоў Аляксандр вярнуўся ў студзені 1983 года. Родныя з нецярпеннем чакалі юнака і былі рады, што вярнуўся жывым і здаровым. Стараліся не трывожыць яго роспытамі пра службу, бо добра разумелі, што тыя ўспаміны цяжкія і балючыя.

Пасля арміі А. Сучок працаваў у раёне электрасетак, неаднойчы выбіраўся дэпутатам гарадскога Савета дэпутатаў, быў народным засядацелем у судзе. Паступіў і паспяхова закончыў юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта і вось ужо другі дзесятак гадоў працуе суддзёй Браслаўскага суда. Часта сустракаецца з тымі, хто некалі, як і ён, выконваў свой воінскі інтэрнацыянальны абавязак, распытвае пра здароўе, справы, праблемы і па меры магчымасці стараецца дапамагчы ў іх вырашэнні. Разам афганцам ёсць што ўспомніць, пра што пагаварыць. Час выбраў менавіта іх прайсці праз вайну.

**З. Палулех**